


# § 1. Уводзіны. Свет у XVI–XVIII стст.

**Успомніце.** *Што азначае паняцце «Сярэднія вякі»? Якія важныя змены ў жыцці грамадства адбыліся ў Заходняй Еўропе ў перыяд Сярэднявечча? Хто такія гуманісты? Якія ідэі яны выказвалі?*

**Вы даведаецеся.** *На якія перыяды дзеліцца сусветная гісторыя. Асаблівасці развіцця заходнееўрапейскай і ўсходніх цывілізацый у Новы час.*

**1. Перыядызацыя гісторыі.** Паняцце Новая гісторыя, або гісторыя Новага часу, узнікла ў эпоху Адраджэння. Еўрапейскія гуманісты лічылі, што ў жыцці людзей пачаўся асаблівы гістарычны этап. Росквіт навукі і мастацтва таго часу яны назвалі новай эпохай. Гуманісты прапанавалі падзяліць гісторыю чалавечага грамадства на тры перыяды: Старажытны свет, Сярэднія вякі і Новы час. У XX ст. гэтыя перыяды былі дапоўнены яшчэ адным пад назвай Навейшая гісторыя. Так з'явілася перыядызацыя сусветнай гісторыі, якой мы карыстаемся і цяпер.

Новы час ахоплівае XVI — пачатак XX ст. Яго можна падзяліць на два вялікія перыяды. Першы перыяд (ранні Новы час) пачынаецца з Вялікіх геаграфічных адкрыццяў і завяршаецца Французскай буржуазнай рэвалюцыяй канца XVIII ст. Другі перыяд новай гісторыі ўключае XIX — пачатак XX ст. Мяжой Новага і Навейшага часу стала Першая сусветная вайна 1914—1918 гг.

**2. Асноўны змест Новага часу.** У Новы час у жыцці чалавечага грамадства адбыліся значныя перамены. Вялікія геаграфічныя адкрыцці прывялі да пашырэння кантактаў краін і народаў і змянілі старыя ўяўленні людзей аб Зямлі, паглыбілі іх веды пра свет. Пачалося рассяленне еўрапейцаў на іншыя кантыненты. Еўрапейцы не толькі ганд-




лявалі, але і захоплівалі новыя землі ў Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы, імкнуліся ўзмацніць свой уплыў на Усходзе.

У Новы час пачалося бурнае развіццё гандлю і мануфактур, узнікла банкаўская справа. На змену натуральнай гаспадарцы прыйшлі таварна-грашовыя адносіны, якія дазволілі людзям свабодна абменьвацца прадуктамі сваёй працы. Гэтыя змены супярэчылі традыцыйнаму ўкладу і феадальнаму ладу ў краінах Заходняй Еўропы. Паступова вядучую ролю пачалі адыгрываць грошы, якія прыносяць прыбытак, або капітал. У эканоміцы зараджаліся новыя адносіны — капіталістычныя. У жыцці грамадства і дзяржавы ўсё большую ролю сталі адыгрываць багатыя людзі — уладальнікі капіталу. Яны не мелі знатнага паходжання і пражывалі ў гарадах. Таму новую праслойку, або клас грамадства, сталі называць буржуазіяй (ад франц. *bourgeois* — гараджанін).

Эканоміка тых краін, дзе фарміраваўся капіталістычны лад, прыкметна паскарала тэмпы свайго развіцця. А буржуазія стала найважнейшай рухальнай сілай прагрэсу еўрапейскага грамадства.

**3. Характэрныя рысы заходнееўрапейскай цывілізацыі.** У Новы час хутка расла і ўзмацнялася заходнееўрапейская цывілізацыя. Змены адбыліся ў развіцці культуры Адраджэння. З’явіліся разнастайныя жанры літаратуры, сфарміраваліся новыя мастацкія стылі. Мастакі і скульптары сталі звяртацца не толькі да біблейскіх тэм, але і адлюстроўвалі навакольную прыроду і рэальных людзей. Падвяргалася сумневу вучэнне царквы, людзі мянялі сваё стаўленне да веры. Гэта нярэдка прыводзіла да канфліктаў і рэлігійных войнаў.

5—6

У гэты ж час мяняліся ўяўленні людзей аб навакольным свеце і самім чалавеку. Узнікла сучасная навука, накіраваная на вывучэнне законаў прыроды і грамадства. Філосафы пачалі задумвацца аб паходжанні

- ˜ °ткае развіццё еўрапейскай цывілізацыі, фарміраванне капіталізму
- Змена формаў дзяржаўнай улады
- Асваенне еўрапейцамі раней невядомых ім зямель
- Фарміраванне межаў большасці сучасных еўрапейскіх дзяржаў

Асноўныя змены, якія адбыліся ў краінах Заходняй Еўропы ў першы перыяд Новага часу

*Прывядзіце гістарычныя прыклады асноўных змен, якія адбыліся ў першы перыяд Новага часу.*

дзяржаўнай улады. Стала папулярнай ідэя аб тым, што дзяржава павінна служыць чалавеку, а не наадварот.

У XVI–XVIII стст. у большасці еўрапейскіх дзяржаў каралеўская ўлада дасягнула нябачанай раней магутнасці. Але на працягу тых жа трох стагоддзяў у некалькіх найбольш развітых краінах Еўропы гэтая ўлада была абмежавана.

*Пакажыце на картасхеме «Вялікія геаграфічныя адкрыцці» на форзацы вучэбнага дапаможніка найбуйнейшыя дзяржавы Заходняй Еўропы.*

Пачатак Новага часу характарызаваўся станаўленнем дзяржаў. Фарміраваліся сучасныя мовы, нацыянальныя культуры. Найбуйнейшымі дзяржавамі ў той час былі Расія, Іспанія, Англія, Францыя, Рэч Паспалітая. Падзеленая на княствы Германія з'яўлялася часткай Свяшчэннай Рымскай імперыі. Італія таксама складалася з мноства дробных дзяржаў.

**4. Асаблівасці развіцця ўсходніх цывілізацый у Новы час.** Да ўсходніх цывілізацый навукоўцы адносяць перш за ўсё краіны Азіі і Паўночнай Афрыкі. У параўнанні з Сярэднімі вякамі традыцыйнае аблічча Усходу ў Новы час істотна не змянілася.

Характэрнай асаблівасцю цывілізацый Усходу было тое, што доўгі час яны развіваліся адасоблена адна ад адной. Вялікую ролю ў жыцці ўсходніх грамадстваў адыгрывалі спецыфічныя прыродныя ўмовы. Клі-





Непаўторнае аблічча кожнай цывілізацыі асабліва яскрава праяўляецца ў культуры. *Злева направа:* Сафійскі сабор у Полацку (Беларусь), храм Рурыкодзі ў Ямагуці (Японія), мячэць Сулейманіе ў Стамбуле (Турцыя)

мат тут быў больш спрыяльным для сельскай гаспадаркі, чым у Еўропе. Таму галоўным клопатам народаў Усходу было правільнае размеркаванне і выкарыстанне тых выгод, якімі яны валодалі. Гэтыя функцыі ўзяла на сябе дзяржава. Яна стала ўласніцай усёй зямлі, нетраў і вады. Усходняя дзяржава строга кантралявала жыццё сваіх падданых, падтрымлівала ўстаноўлены парадак і стабільнасць у грамадстве. Дзяржава сачыла за тым, каб усе пласты насельніцтва своечасова плацілі падаткі. Людзі былі зацікаўлены ў моцнай дзяржаве і таму мірыліся са сваім бяспраўным становішчам у абмен на стабільнасць і ўстойлівасць.

*Пакажыце на картасхеме на форзацы найбуйнейшыя дзяржавы Усходу ў Новы час.*

Такім чынам, правіцелі краін Усходу засяродзілі ў сваіх руках бязмежную ўладу над падданымі. Менавіта ў гэты час небывалага росквіту дасягнула Асманская імперыя, якая пагражала Еўропе і з мора, і з сушы. Магутнай і нязломнай была Цынская імперыя ў Кітаі.

Многія ўсходнія дзяржавы выглядалі не толькі магутнымі, але і казачна багатымі. Гэта ўзмацняла імкненне еўрапейцаў завязаць з імі больш цесныя адносіны. Таму ў XVI—XVIII стст., нягледзячы на ізаляванасць краін Усходу, Японія і Кітай пачалі карыстацца тэхнічнымі і навуковымі дасягненнямі еўрапейцаў, а таксама духоўнымі каштоўнасцямі Захаду. Але прыкметныя перамены ва ўсходніх дзяржавах адбудуцца толькі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.

*Такім чынам, у Новы час фарміраваліся капіталістычныя адносіны ў эканоміцы, выпрацоўваліся нормы нашай паўсядзённай культуры, закладваліся асновы сучаснага свету. Таму вывучэнне гісторыі Новага часу мае для нас важнае значэнне.*

***Ключавыя словы:*** *Новы час, цывілізацыя, капітал, капіталістычныя адносіны, буржуазія.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Чаму гістарычны перыяд XVI–XIX стст. атрымаў назву «Новы час»?
**2.** Якія гістарычныя падзеі абмяжоўваюць першы перыяд Новага часу?
**3.** У чым праяўляліся адрозненні ўсходніх цывілізацый ад еўрапейскай у першы перыяд Новага часу?
**4.** Складзіце «візітную картку» першага перыяду эпохі Новага часу. Адлюструйце ў ёй храналагічныя рамкі, адметныя асаблівасці. У рабоце можна выкарыстоўваць ілюстрацыі, інфармацыю пра выдатных дзеячаў эпохі, а таксама важнейшыя паняцці.